**Наталля Пятрова**

# Калектыўныя формы працы на занятках па беларускай мове ў тэхнічных ВНУ

Вывучэнне роднай мовы ў вышэйшай навучальнай установе (ВНУ) мае вялікае значэнне, паколькі адной з прыярытэтных задач вышэйшай адукацыі з'яўляецца падрыхтоўка асобы, здольнай свабодна карыстацца мовай у прафесійнай дзейнасці. У тэхнічных ВНУ Рэспублікі Беларусь спецыфіка прафесійнага маўлення найперш вывучаецца ў межах такой вучэбнай дысцыпліны, як "Беларуская мова (прафесійная лексіка)". У сувязі з гэтым пошук эфектыўных прыёмаў працы на занятках па беларускай мове ў тэхнічных ВНУ з'яўляецца актуальным у беларускім мовазнаўстве і ў сучаснай лінгвадыдактыцы.

На занятках па беларускай мове ў тэхнічных ВНУ мы прапануем шырока выкарыстоўваць калектыўныя формы працы, якія дазваляюць уключыць у дзейнасць амаль кожнага студэнта, а таксама значна стымулююць пазнавальную актыўнасць навучэнцаў. Найперш мы раім арганізоўваць студэнцкую работу ў парах, якая арыентавана на навучальнае супрацоўніцтва. Яе можна выкарыстоўваць на розных этапах занятку: і ў працэсе вывучэння новага матэрыялу, і ў працэсе замацавання, і ў працэсе кантролю ведаў.

Яшчэ большую эфектыўнасць у навучанні атрымлівае праца ў міні-групах, ці падгрупах. Кожная падгрупа атрымлівае задачу, пэўнае заданне (звычайнае або творчае) і выконвае яго сумесна. Разам з тым, такая форма працы павінна ўлічваць і ацэньваць індывідуальны ўклад кожнага члена падгрупы. Вялікую цікавасць у студэнтаў выклікаюць гульнявыя формы навучання. З вопыту выкладання беларускай мовы ў тэхнічных ВНУ можна сказаць, што эфектыўнасць паказалі такія гульні, як "Поле цудаў" і спаборніцтвы накшталт віктарыны "Што? Дзе? Калі?", якія магчыма арганізаваць як групавыя формы работы.

У вышэйшых навучальных установах у якасці калетыўных форм працы мы прапануем выкарыстоўваць і метад праекта, які не толькі актывізуе працэс навучання, але і садзейнічае творчай самарэалізацыі студэнтаў, развіццю іх інтэлектуальных магчымасцей. Метад праектаў, на наш погляд, уяўляе сабой найбольш гнуткую мадэль калектыўнай арганізацыі навучальнага працэсу ў ВНУ, паколькі рыхтуе студэнтаў да падрыхтоўкі ўласнага, самага важнага за ўсё іх навучанне ва ўстанове, самастойнага дыпломнага праекта. Так, напрыканцы навучання ў ВНУ студэнты абавязаны падрыхтаваць дыпломны праект, абараніць яго, таму выкананне невялікіх сумесных праектаў на занятках

па беларускай мове ўжо на 1-ым курсе ў многім дапаможа навучэнцам у далейшай іх вучэбнай дзейнасці.

Метад праекта на занятках па беларускай мове не толькі дапаможа ўдасканаліць навыкі працы з прафесійнай лексікай і навуковымі тэкстамі, але і будзе спрыяць развіццю камунікатыўных кампетэнцый, паколькі вынікам выканання праекта з’яўляецца яго абарона, выступленне перад аўдыторыяй. Іншымі перавагамі праектнай працы на занятках па беларускай мове таксама з’яўляюцца наступныя рысы: высокая матывацыя з боку студэнтаў; міждысцыплінарны характар; фарміраванне культуры прафесійнай і калектыўнай камунікацыі; навучанне ў дзейнасці; развіццё творчых здольнасцей і інш. Акрамя гэтага, у студэнтаў развіваюцца і некаторыя асобасныя якасці: праца ў праекце патрабуе ад удзельнікаў адказнасці перад калектывам, схіляе падпарадкоўвацца агульнай справе, прыходзіць да агульнага рашэння і інш.

Метад праектаў прадугледжвае наступныя этапы:

1. Фарміраванне груп. Гэта можна зрабіць па жаданні студэнтаў, на выбар выкладчыка (дазволіць аб’яднаць рознаўзроўневых студэнтаў або, наадварот, навучэнцаў аданаго ўзроню), правесці жараб’ёўку ці іншым чынам.

2. Выбар тэмы пракета. Гэты выбар дапаможа зрабіць франтальная гутарка ў групе або тэма можа быць прапанавана выкладчыкам.Выкладчык дапамагае скіраваць студэнтаў у правільным накірунку, сфармуляваць мэту і задачы праекта, размеркаваць ролі і інш.

3. Удзельнікі праекта, працуючы ў групе, вядуць пошук рашэння па сфармуляванай праблеме, аналізуюць атрыманы вынік і робяць высновы аб сваёй працы.

4. Атрыманыя ў ходзе даследавання вынікі кожная група афармляе ў тэкставай форме (рэферат, артыкул, эсэ ці інш.) і прэзентацыі.

5. Кожная група абараняе свой праект, прадстаўляе вынікі сваёй працы ў выглядзе вуснага паведамлення і прэзентацыі.

6. Падводзяцца вынікі працы, і даецца ацэнка дзейнасці кожнай групы.

7. Рэфлексія. Удзельнікі груп самастойна аналізуюць свае праекты, свае выступленні, кожны ўдзельнік вызначае свой асабісты ўклад у калектыўную працу, студэнты абменьваюцца ўражаннямі.

На працягу ўсёй дзейнасці студэнтаў выкладчык дапамагае ім, удзельнічае ў арганізацыі, абмеркаваннях групы, няспынна кансультуе і карэктуе студэнтаў. Яго асноўная задача – стварыць усе неабходныя ўмовы для ажыццяўлення паспяховай студэнцкай праектнай дзейнасці.

Параўноўваючы метад праекта з традыцыйнымі метадамі навучання, можна адзначыць шэраг яго пераваг: працэс навучання максімальна

набліжаецца да практыкі; студэнты назапашваюць вопыт да ўключэння ў будучую навуковую і прафесійную дзейнасць; метад праекта ставіць навучэнцаў перад неабходнасцю адшукваць і прымаць аптымальнае рашэнне; студэнты ўдасканальваюць камунікатыўную, сацыяльную і інфарматыўную кампетэнцыі, праект стымулюе зацікаўленасць навучэнцаў вучэбнай дысцыплінай, роднай мовай.

Найбольш прымальным варыянтам праектнай працы на занятках па беларускай мове з'яўляецца падрыхтоўка навуковага дакладу. Важнай умовай такой дзейнасці лічым прыцягненне ўсіх членаў групы да ўдзелу ў падрыхтоўцы праекта. Група вучыцца сумесна размяркоўваць абавязкі, карэктаваць змест, афармляць конкурсную працу. У выніку абароны праекта ацэньваецца не толькі спрадуцыраваны і правільна аформлены навуковы тэкст (створаны групай студэнтаў даклад), але і актуальнасць абранай тэмы, прэзентацыя, выступленне, уменне абгрунтаваць эфектыўнасць і інш. Падрыхтаваныя праекты можна заслухаць на занятках з наступным калектыўным аналізам зместу дакладаў, прэзентацый і саміх выступленняў. Такая праца дазволіць студэнтам эфектыўна падрыхтавацца да абароны дыпломнай працы на заключным этапе навучання ў ВНУ.

Як паказаў вопыт выкладання беларускай мовы ў тэхнічных ВНУ, эфектыўнасць атрымалі групавыя праекты, звязаныя са складаннем перакладных і тлумачальных слоўнікаў спецыяльнай лексікі па профілі навучання. Напрыклад, у 2020 годзе студэнты 2-га курса БДУІР Ілья Шалль і Яўген Ягаўдзік у выніку сумеснай праектнай дзейнасці склалі кароткі тлумачальны беларускі слоўнік "Пашыраныя прафесіяналізмы сферы IT", у якім растлумачылі кожны прафесіяналізм ці падабралі да яго адпаведны тэрмін. Слоўнік быў укаранёны ў навучальны працэс у якасці матэрыялаў практычных заняткаў па дысцыпліне «Беларуская мова (культура маўлення)», што дазволіла ўдасканаліць працу ў выпрацоўцы навыкаў вуснага прафесійнага маўлення будучых спецыялістаў сферы інфарматыкі і камп'ютарны'х тэхналогій.

Вынікам праектнай студэнцкай дзейнасці па скаладанні вышэйназванага слоўніка стала навуковая праца пад назвай «Прафесійнае маўленне спецыяліста ў галіне інфармацыйных тэхналогій», прадстаўленая на XXVII Рэспубліканскі конкурс навуковых работ студэнтаў. Праца была адзначана на конкурсе 2-ой катэгорыяй. На нашу думку, для студэнтаў 2-га курса тэхнічнай ВНУ гэты вынік значны, паколькі ў лінгвістычнай секцыі былі прадстаўлены ў асноўным навуковыя працы студэнтаў, магістрантаў і аспірантаў філалагічных спецыяльнасцей. Акрамя гэтага, такая калектыўная праектная дзейнасць станоўча паўплывала на агульную паспяховасць студэнтаў, якія пазней паказалі больш высокія вынікі ў падрыхтоўцы і абароне курсавых праектаў.

Такім чынам, калектыўная праца на занятках па беларускай мове дае магчымасць выпрацаваць адносіны супрацоўніцтва, якія неабходныя для стварэння будучых эфектыўных зносінаў у прафесійнай дзейнасці. Найбольш мэтазгодная групавая форма працы ў ВНУ – метад праектаў, паколькі садзейнічае падрыхтоўцы студэнтаў да напісання ўласных навуковых праектаў па спецыяльных дысцыплінах. Праца над праектамі фарміруе ў студэнтаў навыкі падрыхтоўкі прэзентацый, публічных выступленняў, развівае пазнавальную і творчую актыўнасць, самастойнасць, камунікабельнасць, пачуцці адказнасці за вынік перад іншымі членамі групы, крэатыўнасць і многае іншае.